К зрелым годам супруги научились просто не замечать недостатки друг друга и игнорировать мелкие расхождения, хотя конфликты были неизбежны — раздражение и недовольство потихоньку накапливались и порой выливались в бурные ссоры с битьем посуды, с истериками и решением «срочно разойтись». Но поутру эмоции всегда остывали, и в доме вновь воцарялось спокойствие.

Все бы ничего, но время от времени в голове Константина Петровича проскальзывала мысль, что, возможно, на протяжении многих лет он проживает не свою, а чью-то чужую жизнь…

Эта мысль не давала ему покоя. Особенно ярко он почувствовал это, когда на встрече однокурсников встретил старого университетского приятеля Валентина, с которым в годы учебы их объединяли общие планы и увлечения. С удивлением Петрович узнал, что тихий и застенчивый Валик, который робел при виде девчонок и терялся при устных ответах, стал руководителем собственной фирмы, и даже довольно-таки успешной. После официального мероприятия и банкета старые приятели разговорились. Валентин, выслушав однокурсника, загорелся идеей перетащить Константина к себе в столицу, сулил место своего заместителя и даже служебное жилье «в паре сотен метров от офиса». Петрович обещал подумать и обсудить с женой, хотя заранее знал, что супруга, привыкшая к размеренности и спокойствию провинциальной жизни, вряд ли поддержит такую идею.

Вернувшись в гостиничный номер и оставшись наедине с собой, Константин Петрович глубоко задумался. Перед его глазами промелькнула вся его нелегкая и в то же время наполненная солнцем жизнь: окончание школы и выбор дальнейшего пути, встреча с Машенькой на летней танцплощадке, скорая свадьба и переезд в маленький городок, поближе к ее родичам, рождение первенца, поездка к морю, долгожданное повышение… Да мало ли всего было! Петрович вздохнул, улыбнулся, не спеша допил чай и погрузился в воспоминания…

Утром, прощаясь с товарищем на минском вокзале, Константин крепко пожал ему руку и пожелал удачи. Петрович знал, что дома его ждет теплый ужин, куча хлопот и новостей, неизменное бурчание жены по поводу неоконченного ремонта, озорные проделки шумных внуков, вечные споры между детьми, а утром в понедельник — несмолкающий телефон, брюзжащее начальство, надоедливые сослуживцы, аврал и суматоха… Но знал он также, что впереди — много счастливых моментов, которые ничем нельзя заменить.

Татьяна МАЛЬКО

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

НА "БЕЛАЙ СЦЕЖЦЫ" — ЧЫРВОНАЯ ЧАЛАВЕЧАЯ КРОЎ

У мінулую суботу падчас палявання ва ўгоддзях паляўнічага прадпрыемства "Белая сцежка" быў цяжка паранены ў жывот стрэлам з наразной зброі адзін паляўнічы. Расіянін пераблытаў звера з сябрам і трапна стрэліў.

Гаспадарка валодае паляўнічымі ўгоддзямі раёна, у тым ліку Ліпічанскай пушчай, і прадстаўляе свае паслугі замежным паляўнічым — галандцам, немцам, італьянцам ды іншым.

Калі падобныя выпадкі ў мясцовых аматараў палявання надараюцца калі-нікалі, то з замежнікамі тое адбылося ўпершыню.

"МАСТОЎДРЭЎ" ПАД ПАГРОЗАЙ РАЗДАТКІ?

Прэзідэнт РБ заўжды выступае за справядлівасць і сячэ з пляча. Датычыць гэта тых, хто не выконвае яго ўказанні.

У лістападзе навядзенне парадку на прадпрыемствах краіны распачалося з аб'яднання "Барысаўдрэў". Тады былі адхілены ад пасады старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс Батура, намеснік адміністрацыі прэзідэнта Андрэй Тур, старшыня канцэрна "Беллесбумпром" Аляксандр Перавальцаў. Адначасна гендырэктара будтрэста Мікалая Буслава прапанавана ўзбудзіць крымінальную справу.

Сярод іншага прэзідэнт паабяцаў навесці парадак на аднатыпных прадпрыемствах у Івацэвічах і Мастах. Таму прадпрыемства наведаў старшыня Камітэта дзяржкантролю РБ Аляксандр Якабсон. Пасля наведвання "Мастоўдрэва" ў інтэрв'ю гродзенскаму тэлебачанню Якабсон сцвердзіў, што адставанне ад графіка ўводу ў эксплуатацыю цэха драўняна-валакністай пліты скарацілася, але застаецца зусім незразумелай сітуацыя з рэалізацыяй новай прадукцыі. Практычна маркетынг у тым накірунку не працуе, і, магчыма, выпушчаная ў 2015 годзе прадукцыя застанецца на складах.

Акрамя вінаватых у зрыве ўводу ў эксплуатацыю новых вытворчасцей прадпрыемства, старшыня Камітэта дзяржкантролю адзначыў нерытмічнае фінансаванне, а таксама незабеспячэнне падрадчыкам належнай колькасці рабочых.

Як паўплывае на стан спраў на прадпрыемстве прызначэнне былога міністра сельскай гаспадаркі, доктара эканамічных навук, прафесара, пенсіянера Уладзіміра Краўцова кіраўніком вобласці, невядома. Ён паводле ўказу прэзідэнта замяніў Сямёна Шапіру, які, па выказванні прэзідэнта, меў даволі рэзкі стыль працы.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПРАВА ЧЕЛОВЕКА

НИКОЛАЯ АВТУХОВИЧА ЛИШИЛИ СВИДАНИЯ С МАТЕРЬЮ

Николая Автуховича лишили свидания с матерью, которая не видела его ещё с прошлого года, но приняли у нее передачу для сына.

В ноябре у Николая Автуховича планировалось свидание с родственниками, но когда мать политзаключенного Лидия Юльяновна приехала в Гродненскую тюрьму, чтобы встретиться с сыном, то узнала, что свидание запретили. Почему, узнало Радио "Свабода" у Лидии Автухович.

«Откуда же я знаю? Не говорят. Это их право такое: хотят — позволяют свидание, не хотят — не позволяют. Что хотят, то и делают. Не дали — и все. Хорошо, хоть передачу приняли. 30 килограммов. Продукты и вещи. Все тяжелое, что ни купи, все что-то значит. Много не возьмешь. А видела я сына аж прошлым годом и уже, видимо, в этом году не увижу, к освобождению не увижу, наверное. Только осталось, что переписываться. Жду его, конечно. Его многие ждут, а мать — тем более».

Родственники и правозащитники беспокоятся о том, как он переживет зиму. Прошлой зимой, по словам Николая Автуховича, ему приходилось спать в шапке и даже днем было так холодно, что трудно было писать письма.

Предпринимателя из Волковыска Николая Автуховича осудили за хранение нескольких патронов. Правозащитники и оппозиция считают Автуховича политзаключенным, которого наказали за борьбу с коррупцией во власти.

Радио "Свабода"

НАВІНЫ

СЯМЁН ШАПІРА СТАЎ СТАРШЫНЁЙ МІНАБЛВЫКАНКАМА. НОВЫ КІРАЎНІК ГАРАДЗЕНШЧЫНЫ — КРАЎЦОЎ


Сямён Шапіра Уладзімір Краўцоў

Аляксандр Лукашэнка прызначыў былога кіраўніка Гродзенскай вобласці Сямёна Шапіру старшынёй Мінскага аблвыканкама. Аб гэтым БелТА паведамілі ў прэс-службе прэзідэнта.

Новы кіраўнік аблвыканкама — Уладзімір Краўцоў — "усходнік". Нарадзіўся ў Ленінградскай вобласці, усю прафесійную кар'еру рабіў у Магілёве. З 1979 да 1991 — працаваў у структурах камуністычнай партыі. У 2001-2002 гадах займаў пасаду старшыні камітэта эканомікі і рынкавых адносін Магілёўскага аблвыканкама, у 2002-2007 гадах быў намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама, а ў 2007-2012 гадах — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. З 2012 года з'яўляўся старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па эканамічнай палітыцы.

"Твой Стыль"

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

СВІНСТВА СВІННІ ПЕРАМОГУЦЬ

Перамога відавочная, і яна ідзе супольна з жаданнем беларусаў мець на стале не толькі на Каляды і да чаркі сала ды каўбасы, пальцам пханыя, а і на кожны дзень.

Свіная афрыканская чума напачатку занепакоіла вяскоўцаў Мастоўшчыны. Хтосьці з вяскоўцаў калоў свіней, хтосьці хаваў іх у бліжэйшым лесе, калі пералічыць пагалоўе на іх падворкі беспадстаўна прыязджалі сельсаветчыкі, нягледзячы на тое, што на пачатку года палічылі свіней для статыстыкі. Прыязджалі да людзей і міліцыянты з упаўнаважанымі прадстаўнікамі ўлады з патрабаваннем знішчыць свінное пагалоўе.

На граніцах раёна паўсталі міліцэйскія кардоны. На мяжы Мастоўскага і Шчучынскага раёнаў спачатку такі пост размясцілі ў вёсцы Мікелеўшчына. Пасля таго, як "Газета Слонімская" напісала пра яго неэфектыўную дзейнасць, пост перанеслі ў вёску Правыя Масты, на скрыжаванне дарог між гарадамі Гродна, Слонім, Ваўкавыск, Шчучын. На другі дзень пасля з'яўлення ў "ГС" матэрыялу аб неэфектыўнасці і яго працы пост быў агулам зняты. Чыноўнікі ўсіх рангаў палічылі, што адзяржаўленне гадоўлі свіней і гандлю свінінай адбылося. Як сведчанне таму, прадпрымальнікі, што гандлююць свінінай, сталі набываць гэты прадукт на бойні мясцовай каапераці.

Аднак свіней рана пахавалі. Не толькі на стэндах для аб'яў, але ўжо і ў мясцовым друку сталі з'яўляцца аб'явы аб продажы парасят. Праўда, не адноўлена пакуль праца кірмашоў па продажы парасят у Мастах і Лунна. Раней такі гандаль там пачынаўся кожную нядзелю а пяці гадзін ранку ў любы час года і ў любое надвор'е.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НАВІНЫ ДЗЯТЛАЎШЧЫНЫ

БУДЗЕ ХВОРЫМ ДАПАМОГА

У раённай бальніцы з'явілася новенькая "хуткая дапамога".

Аўтамашына абсталявана ўсімі неабходнымі прыборамі і прыстасаваннямі. Для гэтай мэты выдаткаваны грошы, зробленыя на суботніку, а таксама сродкі, што выдзелілі прыватныя і дзяржаўныя прадпрыемствы раёна.

МІНА Ў МЕТАЛАЛОМЕ

Міну прывезлі разам з усякімі жалязякамі на прыёмны пункт у гарадскім пасёлку Казлоўшчына.

Вядома, яе заўважылі не адразу, а калі заўважылі, усе былі ў шоку. Адразу ж паведамілі ў міліцыю, якая без прамаруджвання прыняла меры.

Аказваецца, гэта супрацьтанкавая міна дзесьці праваляўлася з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Шчасце, што ад яе ніхто не пацярпеў.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

След танка

Былі зімовыя канікулы — такое раздолле для сельскай дзятвы. Можна было і нагуляцца ўволю, і бацькам па гаспадарцы дапамагчы. Сяргей Жалудзевіч з вёскі Сонкавічы ў пятым класе, па вясковых мерках самы памочнік.

—Сёння мы з табой будзем дровы пілаваць, — сказаў раніцой бацька. — А як папілуем, то я буду секчы, а ты складаць.

Працаваў хлопчык спраўна, і бацька вельмі радаваўся гэтаму. Ён бачыў, што ў сына ажно лоб узмакрэў, але той не хацеў адпачыць. Ды раптам юны памочнік перастаў цягаць пілу. І бацька здагадаўся чаму: у небе загудзеў самалёт. Сяргей глядзеў да той пары, пакуль маленькая серабрыстая кропачка не знікла з вачэй.

—Здарава! Як вырасту, таксама буду лётчыкам.

—Добрая справа, чаму ж не. Але для гэтага трэба выдатна вучыцца і мець моцнае здароўе. З усім гэтым у цябе нібыта парадак…

Хлопчык з самага маленства марыў пра неба. Гэта мара яшчэ больш умацавалася, калі ў госці да бацькі прыехаў сваяк Максім Шапілевіч, які ўжо некалькі гадоў лятаў на ваенных самалётах. І выпраўка, і форма, і хада гэтага маладога чалавека канчаткова ўзялі ў палон хлапечую душу. А калі аднойчы ён расказаў пра самалёт, пра сваю такую цікавую работу, гул магутных матораў сніўся Сяргею амаль кожную ноч.

Вось і ў гэтую памятную раніцу праз сон пачуў моцны гул. Думаў, што ў небе ляціць самалёт, але гул нарастаў, і ён не быў падобны да гулу самалёта.

—Танкі! На вуліцы танкі! — усхапіўся хлопчык і, нацягнуўшы цёплую вопратку, кінуўся на двор. Ён стаяў ля плоту і назіраў, як побач адна за адной ішлі магутныя машыны.

—Манеўры пачаліся! Бачыш, якая сіла! — крыкнуў ён бацьку, што стаяў ля пуні і таксама назіраў за танкамі.

Раптам здарылася неверагоднае: адзін танк збіўся з курсу і, ломячы плот, рушыў проста на надворак. Плот наваліўся, ён паваліў і Сяргея, які на яго апіраўся. Пад гусеніцай танка апынулася правая нага хлопчыка, у імгненне вока яна ператварылася ў крывавае месіва. Танк спыніўся, з яго выскачыў малады танкіст, потым зноў ускочыў у машыну і даў задні ход.

Выбегшы з хаты, на ўсю ваколіцу загаласіла маці. Бацька падбег да зняверчанага сына і падняў яго на рукі. Сусед Жалудзевічаў Віталь Рубін, які таксама быў у гэты час ў двары, пабег выганяць з гаража сваю машыну. Танкавая калона праехала і спынілася на ўскрайку вёскі. На сваіх старэнькіх "Жыгулях" сусед павёз пакалечанага хлопчыка ў раённую бальніцу. Разам паехаў і бацька. Ён перацягнуў сваім рэменем сынаву ножку ля самай пахвіны, каб няшчасны не сцёк крывёй. Нягледзячы на нясцерпны боль, хлопчык трымаўся мужна. Ён быў у прытомнасці і ціхенька стагнаў.

Аперацыя ішла доўга, і ўвесь гэты час мужчыны сядзелі ў калідоры. Неўзабаве тут з'явіліся і ваенныя людзі.

—Няма слоў… — сказаў у скрусе пажылы падпалкоўнік. — Даруйце нам, калі за гэта можна дараваць.

Ваенныя таксама чакалі, пакуль закончыцца аперацыя. Нарэшце ў калідор выйшаў малады хірург.

—Хто бацька? — спытаў ён. І калі даведаўся, моўчкі са спагадай паглядзеў таму ў вочы. — Хлопчык страціў шмат крыві… Мы зрабілі ўсё, што маглі, а змаглі нямногае: ад ножкі засталася толькі невялікая кукса. З цягам часу да яе можна будзе прыладзіць пратэз. Хлопчык праляжыць у бальніцы доўга, і за ім патрэбен догляд роднага чалавека, каб дапамагчы, падтрымаць. Напрыклад, мамы.

—Чым мы можам дапамагчы? — спытаў падпалкоўнік, хоць і сам не разумеў, пра якую дапамогу тут можа ісці размова.

Бацька паціснуў плячамі і моўчкі пайшоў на вуліцу. За ім пайшоў і падпалкоўнік.

—Хаця можаце, — раптам прамовіў мужчына. — Не карайце строга таго маладога танкіста. Сам служыў, ведаю, што гэта ён не спецыяльна, нешта здарылася. Можа, заснуў…

Рана ў Сяргея загойвалася павалу. Мама дзень і ноч сядзела пры сыночку, лавіла кожны яго погляд, выконвала ўсякую просьбу і была рада, што гэтыя просьбы ёсць. Іншы раз яе падмяняў бацька. За доўгія тыдні, праведзеныя з сынам у бальніцы, яны пастарэлі, да гэтага русыя валасы мамы сталі зусім сівымі.

Тады быў Саюз, праблем з вырабам пратэзаў не было. Хлопчыку зрабілі па яго памеры. Перамагаючы нялюдскі боль, вучыўся на ім хадзіць. Яму прызначылі пенсію.

Ішлі гады. Ён рос, мяняў пратэзы, закончыў школу.

—Трэба, сынок, каб ты набыў якую спецыяльнасць. Па тваіх сілах, напрыклад бухгалтара. Не сядзець жа табе ўвесь век у вёсцы, — параіла мама.

Ён без цяжкасці паступіў у тэхнікум, правучыўся адзін год і вярнуўся дадому.

—Усё, з мяне хопіць! — рэзка сказаў бацькам.

—Чаму? Што здарылася?! — устрывожыліся яны.

—Нічога не здарылася, не магу больш цярпець людскую жорсткасць і несправядлівасць. Мяне некаторыя абзываюць "рубельдваццаць" за тое, што кульгаю. Вядома ж, я не магу разам з імі хадзіць на танцы, да дзяўчат. Усё адзін ды адзін. А тут хоць вы…

Бацькі не сталі яго ўгаворваць вярнуцца на вучобу, ведалі, што гэта не мае сэнсу.

Сяргей набыў патрэбны інструмент і навучыўся рабіць прыгожыя вырабы з дрэва. Іх куплялі аднавяскоўцы, а потым, даведаўшыся пра залатыя рукі майстра, па сувеніры пачалі прыязджаць людзі з іншых мясцін. Яны плацілі і плацяць добрыя грошы. Так што, далучыўшы заробак да невялікай пенсіі, ён, па вясковых мерках, жыве някепска.

Толькі ўсякі раз, калі бачыць у небе серабрыстую кропачку самалёта, яго прыгожыя карыя вочы напаўняюць слёзы. І прыгадваецца той дзень, калі цяжкі страшны танк праехаў не толькі па яго назе, але і па яго лёсе…

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

МАЛЮНАК ЯУГЕНА ІВАНОВА

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

У АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ ПРЫЗНАЛІ, ШТО ПРАВЫ ЖЫХАРА ГОМЕЛЯ ПАРУШАНЫЯ


ФОТА SVABODA.ORG
Уладзімір Сякерка

Камітэт па правах чалавека ААН прызнаў, што беларускія ўлады парушылі правы старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Беларускай партыі левых "Справядлівы мір" Уладзіміра Сякеркі на правядзенне мірнага сходу, забараніўшы ў снежні 2007 года правесці ў Гомелі мітынг у знак нязгоды з адменай ільготаў усяму насельніцтву краіны, напісалі на мінулым тыдні незалежныя інтэрнэт-рэсурсы краіны пасля таго, як гэтае рашэнне стала даступна ў інтэрнэце на ангельскай мове.

У Камітэт ААН Уладзімір Сякерка паскардзіўся, калі не змог абараніць свае правы ў Беларусі.

Гомельскі гарвыканкам забараніў яму і іншым 45 актывістам правесці ў горадзе серыю масавых мерапрыемстваў супраць прыняцця закону аб адмене льготаў усяму насельніцтву, уключаючы дзяцей ва ўзросце да трох гадоў. Гомельскія чыноўнікі запатрабавалі тады аплаціць паслугі міліцыі, камунальшчыкаў ды хуткай дапамогі.

У гэтай справе Камітэт па правах чалавека ААН нагадаў, што калі дзяржава накладае абмежаванне на свабоду мірнага сходу, тады ёй варта садзейнічаць ажыццяўленню права, а не шукаць непатрэбныя або неадпаведныя абмежаванні. Паколькі ўрад Беларусі палічыў, што толькі забаронай мірных сходаў можна забяспечыць грамадскі парадак і бяспеку, ахову маральнасці і здароўя насельніцтва ці абарону правоў і свабодаў іншых асобаў, то парушыў правы заяўніка на свабоду правядзення мірнага сходу паводле артыкула 21 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Цяпер на падставе рашэння Камітэта ААН урад Беларусі мусіць забяспечыць «ахвяры парушэння эфектыўны сродак прававой абароны, уключна з поўным пакрыццём выдаткаў і належнай кампенсацыяй», а таксама абавязаны «не дапускаць падобных парушэнняў у будучыні». Улады Беларусі абавязаны «змяніць нацыянальны Закон аб масавых мерапрыемствах і практыку яго прымянення такім чынам, каб забяспечыць кожнаму права на свабоду правядзення мірных сходаў».

Прынятае ў Камітэце па правах чалавека ААН рашэнне беларускі ўрад павінен апублікаваць у афіцыйных СМІ і выканаць яго цягам 180 дзён. Ды тут варта заўважыць, што ўлады Беларусі падобныя рашэнні выконваць зусім не спяшаюцца.

Юрка КАРПАЧ

ЭКОНОМИКА

Белорусская экономика уходит в тень

Объем скрытой экономической деятельности в Беларуси может составлять порядка 30-33% ВВП.

Недавно Лукашенко заявил, что проблема теневой экономики в Беларуси не приобрела большой остроты. Тем не менее вопросы оценки объемов теневой экономики с целью принятия эффективных мер для ее минимизации, предотвращения укрывательства доходов от налогообложения и борьбы с легализацией теневых доходов являются весьма важными и актуальными как для нашей страны, так и для любой другой.

Под термином «теневая экономика» международные организации понимают легальную рыночную деятельность (без учета преступного бизнеса), скрытую от властей ради ухода от налогов, из-за жестких норм рынка труда и т.д.

В Беларуси оценкой объемов ненаблюдаемой экономики, которая представляет собой совокупность скрытой, неформальной и незаконной экономической деятельности, занимается Национальный статистический комитет. По его оценке, ныне объем ненаблюдаемой экономики в стране составляет 20-22% ВВП.

БЕЛОРУССКАЯ МЕТОДИКА

В методике расчета объемов ненаблюдаемой экономики в Республике Беларусь даны определения скрытой, неформальной и незаконной экономической деятельности.

Так, скрытая экономическая деятельность — это деятельность по производству и обращению товаров и услуг, разрешенная законом, но преднамеренно скрываемая (полностью или частично) с целью утаивания доходов и невыплаты (или уменьшения выплаты) налогов и других обязательных платежей.

Неформальная экономическая деятельность — деятельность по производству, обращению и использованию товаров и услуг, которая осуществляется в основном на законном основании физическими лицами, индивидуальными предпринимателями, основанная на неформальных отношениях между участниками производства.

Незаконная экономическая деятельность — деятельность по производству, обращению и использованию запрещенных белорусским законодательством товаров и услуг.

У МЕЖДУНАРОДНЫХ ОРГАНИЗАЦИЙ ЦИФРА ВЫШЕ

Что же касается теневой экономики, то Национальный статистический комитет ее масштабы не определяет. Но если соотносить понятия и учесть, что понимает под теневой экономикой Всемирный банк, то получается, что скрытая экономическая деятельность в определении Белстата является термином, наиболее близким по содержанию к теневой экономике.


Объем же скрытой экономической деятельности Белстатом оценивается в 12-13% ВВП. То есть это и будет официальная оценка объемов теневой экономики в Беларуси.

Отметим также, что министр по налогам и сборам Владимир Полуян в августе заявил: объем теневой экономики в Беларуси оценивается в 8-10% ВВП. Примечательно, что в версии министра в эти 8-10% включены также доходы от приусадебных хозяйств граждан, реализации личного имущества. Такие доходы домашних хозяйств учитываются в скрытой экономической деятельности, которую считает Белстат.

Международные эксперты не включают доходы домашних хозяйств в определение теневой экономики. Тем не менее, по оценкам Фридриха Шнайдера, на исследования которого опираются Всемирный банк и Международный валютный фонд, объем теневой экономики в Беларуси в 2007 году составлял около 53% ВВП.

В этот же период заместитель министра по налогам и сборам Василий Каменко утверждал, что доля теневой экономики в Беларуси была около 15% ВВП. Как видим, оценка белорусских чиновников и международных организаций расходится в три с лишним раза. Если же из оценок белорусской стороны исключить еще и доходы домашних хозяйств, то расхождения будут еще больше.

К сожалению, более свежих оценок теневой экономики в Беларуси Всемирный банк на настоящий момент не дает.



ОТКУДА БЕРУТСЯ ЗАРПЛАТЫ В КОНВЕРТАХ

Для оценки скрытой и неформальной экономической деятельности Белстат использует официальные статистические отчеты малых предприятий, микроорганизаций и крестьянских (фермерских) хозяйств. Но реальный же объем производства, оказания услуг, выполнения работ значительно отличается в большую сторону от цифр из отчетов, предоставленных в государственные органы.

Те же налоговые органы не случайно отмечают, что укрывательство доходов от налогообложения наиболее распространено в таких видах деятельности, как ремонт и техническое обслуживание автомобилей (услуги автосервиса), строительно-ремонтные работы, автоперевозки, компьютерные услуги. Недаром фискальные органы пытаются вести борьбу с выплатами зарплаты «в конвертах». Понятно, что источником таких выплат являются как раз неучтенные доходы.

Не все занятые в неформальной экономической деятельности честно об этом указывают в статистических обследованиях. То есть объективно количество занятых наверняка больше, нежели по данным статистических обследований.


Очевидно, реальный объем производства у субъектов малого предпринимательства выше, чем показано в статистических отчетах. Косвенным подтверждением могут служить расхождения в размерах средней заработной платы у отчитывающихся субъектов малого предпринимательства и средней зарплаты по отраслям народного хозяйства страны.

Так, номинальная начисленная среднемесячная заработная плата работников в микро- и малых организациях по Минску за 2012 год в строительстве была 4 млн. 395 тыс. рублей, в сфере транспорта и связи — 2 млн. 940,2 тыс. рублей. В целом же номинальная начисленная среднемесячная заработная плата во всех организациях по Минску за 2012 год в строительстве составила 5 млн. 42 тыс. рублей, а в сфере транспорта и связи — 4 млн. 551 тыс. рублей.

То есть официальные цифры зарплаты работников субъектов малого предпринимательства явно занижены. На практике самой сильной мотивацией привлечения наемных работников малого предпринимательства является как раз более высокая заработная плата за одинаковую работу. Разница между официальной и реально получаемой зарплатой и выдается «в конвертах».

Сопоставляя вышеназванные данные, логично предположить, что объем скрытой экономической деятельности заметно больше, чем оценивает Национальный статистический комитет, и может составлять порядка 30-33% ВВП.

«Белорусские новости»



Пусть это утро будет для вас ДОБРЫМ, и пронесется это добро до следующего утра, и так — всегда.


Возможно ли, чтобы так было всегда? Да, если научиться просыпаться ДОБРЫМ. Пусть первой проснется улыбка. Она ничего не видит и не слышит, но еще спросонку, улыбнувшись, к разуму притягивается нечто доброе и спокойное. И к тому же она всегда приятна тому, кто видит её на ваших устах.

А если её подарить, просто так, просто прохожему? Ну и что, что он может быть угрюмым и озабоченным. Может быть, в это утро он не проснулся ДОБРЫМ и, может, ваша улыбка сделает чудо, пусть даже вы и не узнаете о нём.

Ведь добро — оно так желанно для всех. И делая добро, не унываем, когда не видим и не слышим взаимности. Ведь оно может откликнуться оттуда, откуда и не ждем.

…Давайте просыпаться ДОБРЫМИ!

Алёна АЛЬКО



Улыбнись,жизнь прекрасна)))

АФИША

КИНОТЕАТР «МИР»

20.11

Зал — «Очень страшное кино — 5», США, комедия; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Тайна рода», США, ужасы, триллер; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

21.11

Зал — «Очень страшное кино — 5», США, комедия; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Тайна рода», США, ужасы, триллер; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

22.11

«Очень страшное кино — 5», США, комедия; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Тайна рода», США, ужасы, триллер; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

23.11

Зал — Детский сеанс «Как приручить медведя», США, приключения; сеанс в 14.00; «Очень страшное кино — 5», США, комедия; сеанс в 16.00. Дискотека. Начало в 18.00

Видеосалон — «Тайна рода», США, ужасы, триллер; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

24.11

Зал — Детский сеанс «Как приручить медведя», США, приключения; сеанс в 14.00; «Очень страшное кино — 5», США, комедия; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Тайна рода», США, ужасы, триллер; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

ТЕАТР

Детский спектакль

«Маугли»; в 12.00; цена 10 тыс. руб.

РДК

26.11

Московский театр «АРТ-центр»

Лирическая комедия «Когда мужа нет дома», в главной роли Анфиса Чехова

Цена билета 100 тысяч; начало в 18.30

НАЧИНАЕТСЯ ПОДПИСКА НА 1-Е ПОЛУГОДИЕ 2014 ГОДА



ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА 1-Е ПОЛУГОДИЕ 2014 ГОДА

30.11.2013 ПЯТНИЦА

10.00-11.00 ДЕРЕВНАЯ
11.15-11.45 НОВОСЕЛКИ
12.00-12.30 ВИШЕВО
12.50-13.30 ВЫСОЦК

07.12.2013 ПЯТНИЦА

10.00-11.00 ДЯТЛОВО
11.30-13.00 КОЗЛОВЩИНА
13.20-13.40 ПАВЛОВО
13.45-14.00 НОВОСЕЛКИ
14.10-14.20 ТАЛЬКОВЩИНА

14.12.2013 ПЯТНИЦА

9.30-09.50 ОЗГИНОВИЧИ
10.10-10.40 МЕЛЬКАНОВИЧИ
11.00-11.10 ОСТРОВО
11.20-11.30 МИЖЕВИЧИ
11.40-11.50 ПАСИНИЧИ
12.00-12.50 СЕЛЯВИЧИ
13.00-13.10 Б.КРАКОТКА
13.30-14.00 ОЗЕРНИЦА
14.20-14.40 ЕЛКА

21.12.2013 ПЯТНИЦА

9.30-09.50 ШИЛОВИЧИ
10.00-10.20 ЖИРОВИЧИ
10.40-11.10 ПАРТИЗАНОВКА
11.20-11.40 НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
12.00-12.20 СУРИНКА
12.30-12.50 ГЛОВСЕВИЧИ
13.00-13.20 ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

28.12.2013 ПЯТНИЦА

10.00-10.20 ЗЕЛЬВА
10.30-10.50 ДЕРЕЧИН
11.00-11.20 ГОЛЫНКА
11.40-12.10 КОСТРОВИЧИ
12.20–13.00 СЕНЬКОВЩИНА
13.10-13.30 ВАСИЛЕВИЧИ

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!

И ДЛЯ ЭТОГО ЕСТЬ ПЯТЬ ПРИЧИН

1. «Газета Слонимская» – это газета, которая на рынке СМИ уже 16 лет. Нам можно доверять.
2. Те, кто подпишется на I полугодие 2014 года, примут участие в розыгрыше удивительных сюрпризов.
3. Подписавшись на квартал, Вы получите право на размещение в газете бесплатного частного объявления.
4. Подписная цена на «Газету Слонимскую» приемлема для всех.
5. Подписываясь на «Газету Слонимскую», Вы поддерживаете демократию.



ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 1–Е ПОЛУГОДИЕ 2014 ГОДА			
Наименование печатного издания	на 1 месяц	на квартал	на полугодие
"Газета Слонимская" + "Отдушина"	26 000 руб.	78 000 руб.	156 000 руб.

ВЫРЕЖИ КУПОН, ЗАПОЛНИ ИЗВЕЩЕНИЕ, ПЕРЕЧИСЛИ ДЕНЬГИ НА Р/С И ОТПРАВЬ ПО АДРЕСУ: 231799, Г. СЛОНИМ, УЛ. КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 41, ИЛИ ПОЗВОНИ ПО ТЕЛ. 5-09-31, 8-029-322-06-42 — И НАШ КУРЬЕР ПОДПИШЕТ ВАС НА ДОМУ ИЛИ В ОФИСЕ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф–л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

Кассир
Плательщик

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф–л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П. Плательщик

УП редакции газеты "Газета Слонимская", УНП500478342, рег. свид. №64, от 05.03.09, Мин. инф. РБ

В гости к ребятам пришли актёры

Артисты Роман Войтулевич и Ирина Яцук (в центре)

Ученики СШ №4 на встрече с артистами

В Народном музее имени А. Жуковского ученики средней школы №4 встретились с актёрами Слонимского драматического театра Ириной Яцук и Романом Войтулевичем.

Ирина и Роман рассказали ребятам о том, как они пришли в профессию и какими качествами необходимо обладать актёру. Во время встречи школьники получили ответы на вопросы об актёрской профессии, любимых ролях и творческих планах.

Участники встречи посмотрели слайды из спектаклей, в которых роли исполняли актеры, и видеоролик с эпизодами из спектакля «Вось табе і гоцаца”.

Благодаря встрече с артистами ребята узнали больше о людях, которые работают на сцене Слонимском драматического театра.

Валентина РАДИШЕВСКАЯ
Фото автора

Слёзкі сонца

— Дзеці, як утвараюцца хмары? Хто раскажа? — запыталася Ніна Пятроўна ў пяцікласнікаў.

Васілёк падняў руку. Няўжо не выкліча, не заўважыць яго настаўніца? Ён ведае, як утвараюцца хмары.

— Калі ласка, Васілёк, — усё-ткі заўважыла Ніна Пятроўна, выклікала.

Хлапчук устаў, кашлянуў, каб прачысціць горла, і сказаў:

— Хмары — слёзкі сонца.

У класе зашапталіся, а Рыгор, які сядзеў на суседнім радзе, заўсміхаўся.

Настаўніца нахмурылася.

У класе стала ціха.

— Хмары — слёзкі сонца, — цвёрда паўтарыў Васілёк, хоць і не зразумеў, каго асудзіла настаўніца. Выклік можна было пачуць у яго-ных словах.

— Няпраўда! — не сцярпеў, выкрыкнуў Рыгор і ўскочыў з-за стала. Ён быў выдатнікам, першым вучнем у класе.

— Пачакай, Рыгор, — прамовіла Ніна Пятроўна.

Рыгор кіўнуў лабастаю галавою і сеў.

Васілёк стаяў роўненька, выцягнуўшыся ў струнку. Ён чакаў, калі Ніна Пятроўна дазволіць яму гаварыць.

— Васілёк, ты дакажаш нам, што хмары — слёзкі сонца? — краёчкамі вуснаў усміхнулася настаўніца.

На ілбе Васілька выступілі кропелькі поту.

«Я яшчэ не даказваў сваю думку. Мне цяжка. Зразумейце мяне і не смейцеся, калі ласка», — хацелася сказаць яму.

— Дакажаш? — напомніла Ніна Пятроўна.

Зараз настаўніца прамовіць: «Сядай». І тады выдатнік Рыгор у час перапынку з пагардай паглядзіць на яго і засмяецца проста ў твар.

— На нашай планеце шмат вады…

— Адкрыў Амерыку! — усклікнуў Рыгор і азірнуўся, шукаючы падтрымкі ў аднакласнікаў.

— Сонца награвае ваду, і яе кропелькі ляцяць да яго.

У класе зноў зашапталіся, данёсся чыйсьці смех.

— Ніна Пятроўна, ён няправільна расказвае! — запярэчыў Рыгор.

— Чаму няправільна?

— Трэба расказваць так, як напісана ў вучэбным дапаможніку.

— Як, Рыгор?

— Сонца за адну хвіліну выпарае на Зямлі мільярд тон вады.

Васілёк ведаў, што за адну хвіліну сонца выпарае на Зямлі мільярд тон вады. Дома ён часта ўяўляў, як сваімі цёплымі рукамі сонца дакранаецца да вады… Угору ляцяць пырскі, рассыпаюцца безліччу кропелек і паднімаюцца ўсё вышэй і вышэй.

— Ты ўсё сказаў, Рыгор?

— Магу яшчэ сказаць.

— Потым скажаш. Цяпер твайго аднакласніка паслухаем, — падахвоціў Васілька голас настаўніцы.

— Я буду расказваць па-свойму. Так, як думаю, як уяўляю. Можна, Ніна Пятроўна?

— Можна.

Рыгор, заўважыў Васілёк, скрывіўся і сціснуў кулакі, нібыта перад бойкай.

— Маленькія кропелькі імкліва ляцяць уверх. Да сонца! Да цёплых рук сонца! Шмат кіламетраў ляцяць, рассыпаюцца!.. Вакол іх цёплае паветра!.. Усё цягнецца да цяпла. Хіба не так, Ніна Пятроўна?

— На шматкіламетровай вышыні, дзе тэмпература больш нізкая, паветра ахалоджваецца, — апярэдзіўшы Ніну Пятроўну, панура прагаварыў Рыгор.

— А ты думаеш, кропелькі не ведаюць гэтага? — запытаўся Васілёк.

Рыгор паціснуў плячыма. Ён не разумеў Васілька.

— Ведаюць і ўсё роўна ляцяць, каб стаць хмаркамі — слёзкамі сонца. Потым яны ўпадуць на Зямлю. Так будзе заўжды!

Васілёк замаўчаў. Яму не хапала слоў, ён не ведаў, што казаць далей.

— Так і мы заўжды будзем цягнуцца да цяпла. Нас заўсёды будзе вабіць вышыня, — сказала Ніна Пятроўна.

Аляксей ЯКІМОВІЧ

МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

На досуге

Что? Где? Когда?

1. Следы поисков этого остались на географической карте: город в Техасе, города в Арканзасе, в Иллинойсе (США), в Венесуэле. Как называются все эти города?

2. В Китае этот цветок считается символом долголетия, в Японии он олицетворяет застенчивость. В Монголии его корень кладут в суп, а поджаренные семена подмешивают в чай. Что же это за чудо-цветок?

3. По свидетельству монастырских хроник 11-го века, их изобрела мать короля франков Карла Великого. Заботясь об отдыхе своего утомленного государственными делами и пирами отпрыска, она случайно бросила взгляд на льняные скатерти. Впоследствии новинка привилась во Франции, при дворе, и начала свое победное шествие по Европе. Что же изобрела, по преданию, мать Карла (а все мы пользуемся)?

4. Знаменитый путешественник Пржевальский рассказывал, как он ходил в Монголии на базар с мешком, набитым «чайными кирпичами». А зачем?

Сканворд

ФОТО ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

Слово-пароль

Ответы на сканворд:
По горизонтали: Глобус. Арама. Амо. Таран. Ботаник. Алла. Оки. Ира. Ион. Кивер. Нрав. Кабина. Наина. Анап. Город. Сорока. Наган
По вертикали: Малина. Лори. Банан. Злато. Вагон. Оратор. Ора. Барак. Рог. Куманика. Ока. Сани. Ибадан. Кивин. Марена. Арал.

Ответы
1. Эльдорадо. **2.** Пион. **3.** Простыни. **4.** Они служили деньгами.

Старонку падрыхтавала Жанна ПЛЕШКО

РЭДАКЦЫЯ

Намеснік галоўнага рэдактара Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты Уладзімір ШУМЕЛЬ, Яўген ВАЛАДАШЧУК, Кацярына ЯНУШЭВІЧ, Таццяна ДЗЕНІСЮК
Стыль-рэдактар Жанна ПЛЕШКО

Галоўны бухгалтар Юлія ЛІБІК
Бухгалтар Кацярына ГЕРАСІМЧЫК
Аддзел падпіскі і продажу Ігар ЯРАШ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн Уладзімір КАЧАРГА, Алена ДЗЯТЛАВА

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: 8 (01562) 5-09-31,
Тэл. 4-79-34, 2-33-95.
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім, вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы Ганна ВАЛАДАШЧУК
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі Дар'я КРУПНІК, Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
8-(044) 715-90-03 (9.00-16.00)
т/факс: 8-(01562)-5-09-27

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Касаўскі рынак, галоўны корпус, другі паверх, каб. №14
Працуем аўторак — пятніца 9⁰⁰-17⁰⁰
субота — нядзеля 9⁰⁰-15⁰⁰
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

Газета Слонімская
20 лістапада 2013 года №48 (859)

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 20 ноября	4°	8°	7°
ЧЕТВЕРГ, 21 ноября	6°	8°	7°
ПЯТНИЦА, 22 ноября	6°	9°	8°
СУББОТА, 23 ноября	8°	9°	8°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 24 ноября	5°	4°	1°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 25 ноября	-3°	0°	-1°
ВТОРНИК, 26 ноября	-3°	0°	-4°
СРЕДА, 27 ноября	0°	0°	-4°

http://www.meteoprog.by

ПРОШУ СЛОВА

ИМЕТЬ ТАТУИРОВКУ — ПОРОК?

Слово «татуировка» образовано от слова «тать», которое в переводе с церковнославянского означает «вор».

Считается, что татуировки вошли в моду совсем недавно, однако это далеко не так. Учёные утверждают, что они были известны ещё в глубокой древности, за несколько тысячелетий до нашей эры.

В разные периоды человеческой истории отношение к изображениям на теле было неоднозначным. С одной стороны, они пользовались большой популярностью, в том числе и среди русской дореволюционной аристократии и царского двора, с другой — татуировки являлись одним из способов наказания преступников.

Иметь клеймо осужденного считалось большим позором, и бывали случаи, когда виновные в преступлении стремились избавиться от несносного знака. Вспомним хотя бы героиню романа Александра Дюма «Три мушкетёра» Миледи, которая на левом плече имела, как повествует автор, клеймо — «цветок лилии небольшой, рыжеватого оттенка и как бы полустёртый с помощью разных притираний».

После Октябрьской революции в России любое изображение на теле наносить запретили, считалось, что это «пережиток царского режима», а по директиве Всероссийской чрезвычайной комиссии «отмеченных» людей даже расстреливали.



Первый и единственный в России художественный салон татуировки, открытый в 1906 году в Санкт-Петербурге, из-за отсутствия спроса закрыли. Но тату находит себе пристанище в тюрьмах и лагерях. С тех пор на долгие годы у русских человек с татуировкой относился к тем, кому пришлось побывать в местах не столь отдалённых.

Сегодня сделать понравившееся изображение на теле очень просто. Во многих городах нашей республики существуют специальные салоны, которые готовы каждому сделать тату. В основном клиенты таких салонов — молодёжь, школьники, которые желают выделиться из толпы. В зрелые годы юношеский максимализм проходит, но, заклеймив себя однажды, люди остаются с этим на всю жизнь. Хорошо, если тату спрятано, а если на виду?

Летом мне пришлось встретить женщину, на вид лет сорока, у которой на руке «красовалось» тату в виде огромной спелой клубники. Некогда упругая кожа потеряла свою притягательность, как и изображение, которое теперь стало уродовать место, где оно находилось. Прикрыть тату несчастной не всегда получается, и потому ей постоянно приходится испытывать недобрительный взгляд людей разного возраста, дискомфорт и сожаление, что ничего изменить уже нельзя.

Или, к примеру, молодой человек на пальцах выгравировал имя своей возлюбленной, но потом по стечению разных жизненных обстоятельств они расстались. Он признавался, что надпись на пальцах жгла, отдавала едким запахом, хотелось от неё освободиться, а избавиться не мог — поздно. Сегодня он в пожилом возрасте и счастлив, у него прекрасная семья, но татуировка напоминает о первой неудавшейся любви не только ему, но и всем, кто находится рядом.

Некоторые считают, что татуировки украшают тело человека, делают мужественнее мужчину, а женщину — загадочнее. Другие доказывают обратное — рисунок на теле портит и уродует даже самого красивого человека. Единого мнения нет. Каждый должен решить для себя сам, нужна ли ему коррекция естественной белизны кожи. Важно только, чтобы шаг был обдуманным, взвешенным, принятым не под влиянием мимолётного порыва стать заметнее, нравиться другим.

Смогу ли я испытывать то же удовольствие от изображения на коже через десять-двадцать лет? — вот вопрос, на который следует дать себе ответ перед тем, как идти в салон тату.

Андрей ЧЕРНЫХ

КРИМИНАЛ

«ДОПИНГ» ПРИНОСИТ РЕЗУЛЬТАТЫ

Днями сотрудники милиции в результате мероприятий, которые проходили в рамках специальной программы «Допинг», в доме у 31-летней жительницы С. города Слонима обнаружили и изъяли 0,109 грамма экстракционного опия и 0,06 грамма ацетилированного опия, сообщает сайт http://slonim.grodno-region.by.

В отношении женщины возбуждено уголовное дело.

Аналогичное уголовное дело возбуждено и в отношении ранее судимого 44-летнего слонимчанина. В ходе проведения личного обыска у него обнаружено и изъято более 5 граммов марихуаны.

Виктория ЛЕОНКО

Дзякуй за тое, што выбралі “Газету Слонімскую”!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Адрас рэдакцыі: г.Слонім, вул. Косаўскі тракт, д. 37, офіс 16
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 19 лістапала 2013 года **16:00**.
Аб'ём — восем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 6331